критических ситуаций применяется посекундная идентификация события. Видеопоток может останавливаться для того, чтобы с помощью стоп-кадра сфокусировать внимание зрителя на определенных деталях и дать возможность журналисту или эксперту объяснить изображаемое.

Разнообразные источники, формы использования фото- и видеоконтента в визуальных расследованиях, основанных на использовании открытых ресурсов, а также способы их верификации являются средствами современной мультимедийной журналистики, обладают значительным потенциалом воздействия на современного зрителя. Отдельные приемы и методы работы с визуальными данными могут быть применены не только в форме визуальных расследований, но и в других формах современной мультимедийной журналистики.

### Библиографические ссылки

1. Visual investigations // The New York Times [Electronic resource]. 2021. URL: www.nytimes.com/newsletters/visual-investigations (date of access: 10.09.2021).
2. Metadata Schema and Archiving // Bellingcat [Electronic resource]. 2019. URL: https://yemen.bellingcat.com/methodology/metadata-scheme (date of access: 10.09.2021).

## ПУБЛІКАЦЫІ Р. В. БУЛАЦКАГА Ў СТУДЭНЦКІМ ДРУКУ

***П. Л. Дарашчонак***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*pdoroshhyonok@mail.ru*

Аналізуюцца публікацыі Р. В. Булацкага ў вучэбных выданнях факультэта журналістыкі БДУ, дзе выдатны вучоны і педагог настойліва і паслядоўна развіваў прыярытэтныя кірункі ў працы з выхаванцамі журфака: падрыхтоўка высокакваліфікаваных работнікаў СМІ, у якіх арганічна спалучаюцца высокія ідэйна-маральныя якасці і прафесіянальнае майстэрства, дае свой плён толькі пры мэтанакіраванай палітыка-выхаваўчай рабоце ўсяго выкладчыцкага калектыву, маладзёжнага актыву і ў цесным супрацоўніцтве з журналістамі-практыкамі.

***Ключавыя словы:*** факультэт журналістыкі; падрыхтоўка спецыялістаў СМІ; кадры выкладчыкаў; прафесіянальнае майстэрства; знакамітыя выпускнікі.

# PUBLICATIONS OF G. V. BULATSKY IN THE STUDENT PRESS

***P. L. Doroshchenok***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: P. L. Doroshchenok (pdoroshhyonok@mail.ru)*

The publications of G. V. Bulatsky in the student editions of the Faculty of Journalism BSU are analyzed. This outstanding scientist and lecturer persistently and consistently developed priority areas in working with students of journalism: training of highly qualified media workers, who organically combine high ideological and moral qualities and professional skills, is only efficient when there is a purposeful political and educational work of the entire teaching staff and youth activists, as well as a close cooperation with practicing journalists.

***Key words:*** faculty of journalism; training of media experts; teaching staff; professional skills; famous alumni.

Сярод навуковых артыкулаў, манаграфій, падручнікаў, хрэстаматый прафесара Р. В. Булацкага найменш вядомыя яго публікацыі ў студэнцкім друку – газеце «Беларускі універсітэт», вучэбнай газеце «Журналіст», асобныя матэрыялы аб гісторыі факультэта ў часопісе «Веснік БДУ», гістарычныя нарысы аб гісторыі факультэта журналістыкі ў юбілейныя даты [1]. Амаль невядомыя сённяшнему чытачу і тэксты яго выступленняў на юбілейных факультэцкіх мерапрыемствах. Якія тэмы ўзнімаў у студэнцкіх выданнях Р. В. Булацкі пры ўсёй яго занятасці справамі факультэта, навуковымі камандзіроўкамі, працай над кандыдацкай і доктарскай дысертацыямі?

У 1951 г., пасля ўручэння дыплома аб заканчэнні аддзялення журналістыкі філалагічнага факультэта БДУ, Р. В. Булацкі рабіў свае першыя крокі ў практычнай журналістыцы. Будучы на роднай Бабруйшчыне, завітаў у рэдакцыю абласной газеты «Савецкая Радзіма», дзе атрымаў разам з супрацоўнікам рэдакцыі Б. В. Стральцовым камандзіровачнае заданне – падрыхтаваць рэпартаж аб уборцы зерневых у Глускім раёне. Да тандэма маладых журналістаў далучыўся і фотакарэспандэнт абласной газеты Ю. Лыскоў. Так на старонках газеты «Савецкая Радзіма» (Бабруйск) 31 ліпеня 1951 г. з’явіўся рэпартаж за

подпісамі Б. Стральцова і Р. Булацкага пад загалоўкам «Залаты паток» з перадавога калгаса імя Сталіна. Тады, сем дзесяцігоддзяў таму, узнікла моцная дружба двух маладых журналістаў, якая з цягам часу перарасла ў творчае і навуковае супрацоўніцтва, сумесную стваральную працу на факультэце журналістыкі прафесараў Р. В. Булацкага і Б. В. Стральцова.

Журналісцкага «хлеба» Р. В. Булацкі паспрабаваў падчас работы ва ўніверсітэцкай газеце «За сталінскія кадры». Рыгор Васільевіч быў прызначаны адказным сакратаром газеты 14 снежня 1951 г. З яго прыходам універсітэцкае выданне набыло новы твар, з'явіліся рубрыкі «Из истории нашего университета», «Их воспитал университет» і інш. Гэта была карысная школа, дзе малады журналіст асвоіў прынцыпы вёрсткі газеты, уменне фарміраваць напаўненне нумара, распрацоўваць перспектыўны план выдання, працаваць з аўтарамі – членамі рэктарата, дэканамі, выкладчыкамі і студэнтамі. Творчае супрацоўніцтва з рэдакцыямі ўніверсітэцкіх выданняў Р. В. Булацкі працягваў і ў наступныя гады. Рабіў ён гэта з вялікай ахвотай, бо разумеў, што калегі з універсітэта і выкладчыкі факультэта, аспіранты і студэнты павінны ведаць, чым жыве факультэт, якія захады прадпрымаюцца для таго, каб разам з дыпломамі журфака маладыя спецыялісты атрымлівалі грунтоўныя веды і ідэалагічную загартоўку.

У 1969 г. Р. В. Булацкі рабіў даклад на святкаванні 25-годдзя факультэта. Захаваўся 20-хвілінны аўдыязапіс яго выступлення ў мінскім Доме акцёра падчас юбілейных урачыстасцей, у якім ён гаварыў аб тым, якія якасці павінен мець выпускнік факультэта журналістыкі: «Журналіст – гэта спецыяліст асобага роду. Ён, перш за ўсё, сапраўдны баец за выкананне партыйных рашэнняў. Ён павінен быць палітычна свядомым чалавекам, які глыбока ведае законы грамадскага развіцця. Журналіст павінен валодаць навуковай строгасцю мыслення, аб'ектыўнасцю аналізу фактаў. Для яго, па словах Энгельса, недастаткова добрых імкненняў, сумленнасці, мужнасці, стойкасці, яму неабходны розум, яснасць у поглядах, добры стыль, многа-многа ведаў. Менавіта такімі мы хочам бачыць нашых выпускнікоў».

У вучэбнай газеце «Журналіст», прысвечанай 50-годдзю БДУ, дэкан факультэта журналістыкі згадваў звесткі аб першых кроках факультэта, створанага ў 1944 г. Звыш 90 працэнтаў студэнтаў тады складалі даваенныя КІЖаўцы, мабілізаваныя з Чырвонай арміі, былыя партызаны. За 27 гадоў выпускнікі факультэта, пазней пераўтворанага ў аддзяленне журналістыкі філфака БДУ, сталі вялікай арміяй работнікаў друку,

радыё, тэлебачання, выдавецтваў і інфармацыйных агенцтваў. Сярод іх былі Герой Савецкага Саюза, доктар гістарычных навук, прафесар А. Філімонаў, карэспандэнты «Правды» (І. Новікаў, Г. Бураўкін) і «Известий» (М. Матукоўскі, М. Шыманскі), намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР Н. Сняжкова, рэдактары рэспубліканскіх газет М. Дзялец («Звязда»), А. Зінін («Советская Белоруссия»), В. Хорсун («Чырвоная змена») і інш. «Некаторыя рэдакцыі газет амаль цалкам укамплектаваны нашымі выпускнікамі, – адзначаў Р. В. Булацкі. – Так, у рэдакцыі «Знамя юности» працуе каля 20 выхаванцаў факультэта, «Чырвонай змене» – 17, «Сельской газете» – 20, «Вячэрнім Мінску» – 14, «Звяздзе» – 22, «Мінскай праўдзе» – 15, «Гомельскай праўдзе» – 13, на Беларускім радыё і тэлебачанні каля 90 чалавек, у выдавецтве «Беларусь» – 15» [2].

Аб шырокай «геаграфіі» месцаў працы выхаванцаў факультэта журналістыкі Р. В. Булацкі пісаў у нумары газеты «Журналіст», прысвечаным 30-гадоваму юбілею журфака ў снежні 1974 г.: «Нашых выпускнікоў можна сустрэць не толькі ў беларускай прэсе, але і на халоднай Поўначы і гарачым Поўдні, у ГДР, Венгрыі. Многія з іх трымаюць сувязь з факультэтам.

Значная частка паэтаў і пісьменнікаў нашай рэспублікі – выпускнікі факультэта журналістыкі БДУ… Сярод іх паэт Мікола Аўрамчык, Іван Новікаў, Георгій Шыловіч, Барыс Сачанка, Іван Чыгрынаў, Міхась Стральцоў, Іван Пташнікаў, Васіль Зуёнак, Галіна Васілеўская, Вольга Сіманава, Яўген Курто, Міхась Герчык, Анатоль Чаркасаў, Уладзімір Паўлаў, Іван Сіпакоў. А колькі надрукавана ў газетах, перададзена па радыё і тэлебачанні нарысаў, апавяданняў, карэспандэнцый, фельетонаў, гумарэсак, памфлетаў, рэцэнзій нашых выпускнікоў за 30 год! Калі выдаць хоць частку іх асобнымі кнігамі, то атрымалася б надзвычай многа тамоў» [3].

У гэтым жа артыкуле дэкан факультэта адзначаў, што факультэт журналістыкі рыхтаваў не толькі высокакваліфікаваных спецыялістаў для сістэмы СМІ Беларусі, але і навуковыя выкладчыцкія кадры. Калі ў 1946–1947 гг. на факультэце працавалі толькі два выкладчыкі журналісцкіх дысцыплін (М. С. Зярніцкі і Г. С. Акулаў), якія не мелі ні вучонай ступені, ні навуковага звання, то да сярэдзіны 70-х гг. XX ст. іх налічвалася ўжо 26. Сярод іх – прафесары, дактары філалагічных навук М. Я. Цікоцкі, В. А. Пыжкоў, Б. В. Стральцоў, А. І. Наркевіч, дацэнты М. Е. Дастанка, Н. А. Сніцарава, Е. Л. Бондарава, А. І. Раковіч, С. М. Грабчыкаў, І. І. Сачанка, С. В. Говін, А. Г. Слука і інш.

У публікацыях, якія Р. В. Булацкі рыхтаваў для студэнцкага друку, выразна бачна гордасць дэкана факультэта за выпускнікоў, якія складалі гонар факультэта – кіраўнікоў рэдакцый СМІ, вядомых вучоных, паэтаў, пісьменнікаў, партыйных і дзяржаўных дзеячаў. Так, у студэнцкай вучэбнай газеце «Журналіст», прысвечанай 45-годдзю БДУ, у артыкуле «Кузня журналісцкіх кадраў» ён называў ужо новыя імёны знакамітых выхаванцаў журфака: М. Сакалоў (рэдактар «Знамя юности»), У. Касько (рэдактар «Чырвонай змены»), Ю. Міхневіч (міністр культуры БССР), У. Матвееў (старшыня Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па кінематаграфіі), М. Сікорскі (рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта) і інш.

У гэтым жа артыкуле Р. В. Булацкі шмат увагі ўдзяліў зместу вучэбных дысцыплін. Ён адзначаў: «Студэнты вывучаюць па ўніверсітэцкай праграме сучасную рускую і беларускую мовы. Пры гэтым яны павінны ведаць дасканала як рускую, так і беларускую мовы. Бо мова для журналіста – яго зброя, без авалодання якой немагчыма стаць работнікам сродкаў масавай інфармацыі і прапаганды. 500 гадзін у вучэбным плане адводзіцца для вывучэння адной з замежных моў (англійскай, французскай, нямецкай або іспанскай). Пры старанных адносінах да вучобы можна дасканала авалодаць адной з іх.

Значная колькасць гадзін адводзіцца на спецыяльныя журналісцкія дысцыпліны, да якіх адносяцца: гісторыя журналістыкі, гісторыя партыйнага і савецкага друку, гісторыя партыйнага і савецкага друку Беларусі, гісторыя замежнага камуністычнага і рабочага друку, тэорыя і практыка савецкай журналістыкі (сюды ўваходзіць і выпуск вучэбнай газеты «Журналіст»), тэорыя і практыка радыёвяшчання і тэлебачання (сюды ўваходзіць таксама выпуск вучэбных радыё- і тэлеперадач).

Курс гісторыі рускай журналістыкі знаёміць студэнтаў з рускім перыядычным друкам з часоў яго ўзнікнення ў пачатку XVIII стагоддзя і да паловы 90-х гадоў XIX стагоддзя, з заканамернасцямі і фактамі развіцця прэсы ў дваранскі і разначынны або буржуазна-дэмакратычны этапы вызваленчага руху ў Расіі. Падрабязна вывучаюцца журналісцкая, рэдактарская і публіцыстычная дзейнасць М. В. Ламаносава, М. І. Новікава, А. М. Радзішчава, І. А. Крылова, дзекабрыстаў, А. С. Пушкіна, В. Р. Бялінскага, А. І. Герцэна, М. П. Агарова, М. Р. Чарнышэўскага, М. А. Дабралюбава, Д. І. Пісарава, М. Я. Салтыкова-Шчадрына, У. Г. Караленкі, А. П. Чэхава, А. М. Горкага» [4].

Прафесар Р. В. Булацкі, звяртаючыся са старонак студэнцкіх газет да выхаванцаў факультэта журналістыкі БДУ, неаднаразова падкрэсліваў, што пры падрыхтоўцы высокакваліфікаваных работнікаў СМІ важна дабіцца спалучэння ў асобе спецыяліста высокіх ідэйна-маральных якасцей і прафесіянальнага майстэрства, што магчыма толькі пры мэтанакіраванай палітыка-выхаваўчай рабоце выкладчыцкага калектыву і студэнцкага актыву, цесным супрацоўніцтве з рэдакцыямі газет, часопісаў, радыё, тэлебачання, інфармацыйнымі агенцтвамі. Традыцыйнымі ў час яго працы на пасадзе дэкана журфака былі сустрэчы на факультэце з вядомымі пісьменнікамі, журналістамі, артыстамі, удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны і героямі працы, экскурсіі на заводы, фабрыкі, у тэатры і музеі.

### Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Булацкий Г. В.* Факультет журналистики. Минск: БГУ, 1979. 12 с.
2. *Булацкі Р.* Крокі сажнёвыя // Журналіст. 1971. 28 кастр.
3. *Булацкі Р.* Упэўненым крокам // Журналіст. 1974. 23 снеж.
4. *Булацкі Р.* Кузня журналісцкіх кадраў // Журналіст. 1976. № 3 (100). 24 мая.

## ФЕНОМЕН ГОНЗО-ЖУРНАЛИСТИКИ В РЕГИОНАЛЬНЫХ TELEGRAM-КАНАЛАХ

***К. В. Дементьева***

*Национальный исследовательский*
*Мордовский государственный университет им. Н. П. Огарёва,*
*ул. Большевистская, 68/1, 430005, г. Саранск, Россия,*
*dementievakv@gmail.com*

В статье рассматриваются региональные Telegram-каналы, дается авторское определение новостного Telegram-канала. На примере канала «Злой мордвин» впервые рассматривается использование черт гонзо-журналистики в новостном сегменте Telegram.

***Ключевые слова:*** Telegram-канал; гонзо; медиа; регион; жанр; мессенджер.